Просто хорошая газета!
Отдушина
МАССОВО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ ГАЗЕТА
Издатель УП "Газета Слонімская" Выходит один раз в неделю Основана 18 октября 2002 года
№23 (352) 1 июня 2011 года

Народныя ўмельцы

Пра майстра чарнадымленай керамікі, які піша вершы і спявае песні

Сяргея Худзяева ў вёсцы Галынка Зэльвенскага раёна лічаць сапраўдным народным умельцам, як кажуць, гэта чалавек ад Бога, які займаецца керамікай. Ён адзіны на Гродзеншчыне майстар па чарнадымленай кераміцы. За сваё майстэрства і аднаўленне старажытнага рамяства майстар з Галынкі шмат разоў узнагароджваўся дыпломамі і медалямі на розных выставах і фестывалях Беларусі.

Сяргей Худзяеў працуе настаўнікам працоўнага навучання і чарчэння ў вясковых школах суседняга з Галынкай Слонімскага раёна. Таму застаць дома майстра можна толькі ў выхадныя дні. Але і ў выхадныя ён не сядзіць без справы, працуе з глінай. За гэтым рамяством і застаў Сяргея Худзяева карэспандэнт "ГС", дзе за ганчарным кругам адбылася наша гутарка.

—Спадар Сяргей, хто навучыў Вас гэтаму майстэрству?

—Ніхто. Сам навучыўся, бо вельмі хацелася навучыцца таму майстэрству, якім у нас мала хто займаецца. І спыніўся я менавіта на чарнадымленай кераміцы, якою некалі вельмі актыўна займаліся народныя майстры з Ружанаў, Пружанаў. Гэтая чарнадымленая кераміка ў свой час мела вялікі поспех у Польшчы. І я самастойна пачаў вывучаць усе друкаваныя матэрыялы, запісваць старых людзей, якія займаліся керамікай, збіраў іншыя звесткі, звязаныя з керамікай. І прыйшоў да высновы, што вырабляць керамічны посуд — гэта не так і складана, галоўнае — умець рабіць абпал глінянага посуду.

Я зрабіў спецыяльную печ для абпальвання. Потым пабудаваў яшчэ адну печ. Не ўсё атрымлівалася спачатку, было шмат браку. Але цяпер навучыўся гліняныя вырабы абпальваць цудоўна, амаль без браку. Перажыўшы апальванне ў агні, посуд накіроўваецца альбо ў спецыяльны адвар, і атрымліваецца прыгожы ўзор, альбо ў дым, калі печ пасля апальвання замазваецца глінай, каб паветра не праходзіла, і амаль суткі вырабы "даходзяць" — у выніку чаго і атрымліваецца чарнадымленая кераміка.


Сяргей Худзяеў за працай

—Для гэтага патрэбна і добрая гліна...

—Так. Гліна павінна быць даволі тлустай, як масла. Там, дзе былі старыя цагляныя заводы, гліняныя кар'еры, — там добрая гліна, там я яе і бяру. Бывае, што гліну прыходзіцца купляць у іншых рэгіёнах Беларусі.

—З гліны Вы вырабляеце толькі посуд?

—Не толькі. Паводле свайго прызначэння кераміка падзяляецца на посуд, на рэчы мастацтва або культу, на будаўнічыя вырабы і г.д. Я займаюся посудам, а ў апошні час спрабую вырабляць і гліняныя цацкі. Дарэчы, гліняныя фігуркі ляпілі яшчэ ў першабытныя часы. Вучоныя-археолагі адкопваюць у старадаўніх курганах фігуркі коней, сабак і іншых свойскіх жывёлін, а таксама бразготкі ў выглядзе пустога шарыка з каменьчыкам усярэдзіне. Страсянеш — бразгаціць. На думку вучоных, свістулькі і бразготкі ўжываліся нашымі далёкімі продкамі не толькі як забаўкі: лічылася, што яны ахоўвалі ад нячыстай сілы. Свіст нібыта адганяў злых духаў, аберагаў ад іх дзяцей. Таму я вырабляю і керамічныя свістулькі.

—А ці купляюць сёння людзі керамічныя вырабы?

—Купляюць, і даволі ахвотна. Купляюць найперш як упрыгажэнне для летнікаў, пакояў, у якіх стаяць каміны і г.д.

Працяг на стар. 2

Народныя ўмельцы

Пра майстра чарнадымленай керамікі, які піша вершы і спявае песні

Працяг
Пачатак на стар. 1

—Спадар Сяргей, раскажыце трохі пра сябе.

—Нарадзіўся я на Зэльвеншчыне ў вёсцы Пруд. Скончыў Брэсцкі політэхнічны інстытут. Працаваў прарабам, інжынерам, настаўнікам, дырэктарам Зэльвенскага раённага Дома рамёстваў у вёсцы Галынка, дзе цяпер жыву. Зараз працую простым настаўнікам у Парэччы і Кастровічах на Слонімшчыне, езджу туды на машыне. Акрамя ўрокаў, вяду ў школах, дзе працую, ганчарныя гурткі, а таксама гурткі выпілоўвання і выпальвання.

—Ці з ахвотай наведваюць Вашы гурткі дзеці?

—Яшчэ ні адзін бацька не сказаў, што вучу дзяцей абы-чаму. Ходзяць у гурткі дзеткі з самых розных сем'яў: і з паспяховых, і з праблемных. Хочацца, каб яны адчувалі прыгожае, вучыліся на добрых прыкладах і самі рабілі дабро. Край наш на таленты вельмі багаты, шмат творчых людзей выйшла з Зэльвеншчыны, Слонімшчыны, Дзятлаўшчыны. Дык мо калі і нашы гурткоўцы пра сябе скажуць — тым больш, што сярод іх нямала здольных творчых асоб. І калі з іх хоць адзін юнак ці дзяўчына захопіцца керамікай у жыцці, то я буду вельмі рады і задаволены.

—Спадар Сяргей, магчыма, і ў Вас былі продкі, здольныя да мастацтва, да керамікі, да вырабаў з дрэва?

—Вельмі здольным быў мой дзед па маці Іскра Пётр Ульянавіч. Я памятаю добра яго. Ён быў мясцовым будаўнікам. Садзікаў раней у вёсцы не было, таму я часам з дзедам хадзіў у сталярку і глядзеў, што ён робіць. Дзед быў майстар на ўсе рукі. Ён рабіў вазы, розныя з дрэва цацкі дзецям, вучыў і мяне сталяраваць. А бацька мой пісаў вершы, добра спяваў і іграў.

—Ведаю, што і Вы, акрамя керамікі, займаецеся і паэзіяй, добра іграеце на гітары, часам выступаеце як бард. Дый чытаў Вашы вершы ў мясцовым друку, у калектыўных зборніках, у "ЛіМе". Памятаю нават асобныя строфы, якія напісаныя проста са смакам:

…У хаце цёпла,
дрэмле котка,
І водар яблыкаў сухіх.
Ад смальнячкоў
жывіцай цягне,
Сасновым борам,
чабарком.
На вожаку каўбаска
вяне
З каляндрай, з
кмінам, з часначком!
А на стале ў дзяжы
пад коўдрай
Пірог падходзіць
дражджавы.
Цялятку маці
варыць пойла,
Насенняў сыпле
ільняных…
У печы з салам млее
бабка,
Капуста з бульбай у
чыгуне,
Шкварчыць з цыбулькаю аладка,
А пах такі, аж
слюнькі прэ…

Цудоўныя радкі. Магчыма, вершаў у Вас назбіралася ўжо на добрую кніжку і пара выдаць іх асобным выданнем?

—У мяне іншая задумка ёсць. Я хачу напісаць і выдаць кніжку пра гліну, пра кераміку. Гэта будзе не навуковая і даследчая кніга. Даследчыкаў керамікі ў Беларусі шмат. Найбольш вядомы і вопытны даследчык керамікі — наш сябра Яўген Сахута. А гэта будзе кніга пра тое, як я асабіста працую з глінай, займаюся керамікай. У гэтую кнігу планую ўключыць і свае вершы. І гэта павінна атрымацца такая керамічная-паэтычная кніга. У ёй я кераміку не пакрыўджу і для паэзіі месца знойдзецца.

Сяргей ЧЫГРЫН



Ідзе апыленне керамікі



Вырабы майстра

Путь к Богу

В чём залог человеческого счастья?



Священник
Павел
ФРАНТИЩИК,
кандидат богословия

У каждого из нас есть естественное стремление к счастью. Но что же составляет настоящее счастье для человека? Давайте попробуем в этом с вами разобраться.

Еще в первые века нашей эры один из христианских учителей, Тертуллиан, высказал мнение, что высшее счастье есть то, что вечно. А вечным является Бог, Творец и Источник Жизни. Библия повествует нам о том, как первые люди, однажды лишившись в результате грехопадения высшего счастья, или блаженства, каковым в раю было непосредственное общение с Богом, стали искать счастье в земных вещах, «хороших для пищи и приятных для глаз» (Быт 3. 6). Однако, утратив возможность вполне наслаждаться земным счастьем, человек испытывает неудовлетворенность (Еккл 5. 9 сл.; 6. 7). Поэтому вся жизнь древнего человека, жившего до пришествия в мир Иисуса Христа, была направлена на восстановление прежнего богообщения путем исполнения Божественного Ветхозаветного Закона. С пришествием на землю Сына Божия, Который дает Новый Закон, человек обретает высшее счастье, или блаженство богообщения. И сущность Нового Закона составляет заповедь о любви, как об этом пишет апостол Павел: «Любовь есть исполнение закона» (Рим. 13. 10). Поэтому истинное человеческое счастье заключается в стремлении и возрастании в любви.

Так, однажды женщина вышла из своего дома и увидела на уличном дворике троих стариков с длинными белыми бородами. Она не узнала их, но сказала: "Наверное, вы мне не знакомы. Но вы, должно быть, голодны. Пожалуйста, входите в дом и поешьте". — "А муж дома?" — спросили они. "Нет, — ответила женщина, — его нет". — "Тогда мы не можем войти", — сказали они.

Вечером, когда ее муж вернулся домой, она рассказала ему о случившемся. "Иди и скажи им, что я дома, и пригласи их в дом!" — сказал муж. Женщина вышла и пригласила стариков. "Мы не можем пойти в дом вместе", — ответили они. "Почему же?" — удивилась она. Один из стариков объяснил. "Его зовут Богатство, — сказал он, указывая на одного из своих друзей, и сказал, указывая на другого: — А его зовут Удача, а меня зовут Любовь". После чего добавил: "Сейчас иди домой и поговори со своим мужем о том, кого из нас вы хотите видеть в своем доме".

Женщина пошла и рассказала мужу о том, что услышала. Ее муж был очень обрадован. "Как хорошо! — сказал он. — Если уж надо сделать выбор, давай пригласим Богатство. Пусть войдет и наполнит наш дом богатством!" Его жена возразила: "Дорогой, а почему бы нам не пригласить Удачу?"

Их дочь слушала все, сидя в углу. Она подбежала к ним со своим предложением: "А почему бы нам лучше не пригласить Любовь? Ведь тогда в нашем доме воцарится любовь!" — "Давай-ка согласимся с нашей девочкой, — сказал муж жене. — Иди и попроси Любовь стать нашим гостем".

Женщина вышла и спросила из троих стариков: "Кто из вас Любовь? Заходи в дом и будь нашим гостем". Старик по имени Любовь пошел в направлении дома. Другие два старика последовали за ним. Удивленная, леди спросила Богатство и Удачу: "Я же пригласила только Любовь, почему вы идете?" Старики ответили: "Если бы вы пригласили Богатство или Удачу, другие два из нас остались бы на улице, но так как вы пригласили Любовь, куда она идет, мы всегда идем за нею. Там, где есть Любовь, всегда есть и Богатство, и Удача!"

31.05.2011г.

Свои вопросы и пожелания читатели "Отдушины" могут адресовать кандидату богословия священнику Павлу Франтищику по адресу: **231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, с пометкой «Путь к Богу», или звоните по тел. 3-60-60, или присылайте SMS-сообщения на тел. (8-029) 133-04-21.**

Выпускники попрощались с детством


Собрались все вместе

27 мая выпускники всех школ Слонимщины отпраздновали последний день детства — День малыша. Старшеклассники таким образом немного отвлеклись от наступающих экзаменов.

Ребята нарядились в детскую одежду, взяли с собой самые любимые игрушки детства и отправились в школу. И вместо одиннадцатиклассников они стали первоклассниками. В школе ребята играли в детские игры, рассказывали стихотворения, а после дружно отправились гулять в центр города.

Прощание с детством — веселый и в то же время грустный праздник. Он для нашего города уже стал традиционным.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора



Играли как дети


Помахала рукой детству

В Слониме подрастают звёзды надежды

В зале Слонимского РДК прошел традиционный концерт под названием «Созвездие надежд», где чествовали талантливых ребят.

Детей награждали в следующих номинациях: «Грант», «Триумф», «Открытие», «Вдохновение», «Аплодисменты», «Спортивный олимп». Кроме дипломов, юные таланты получили денежную стипендию.

Также на празднике вручили орден Матери Татьяне Крыт, которая является многодетной мамой.

Этот праздник подготовили творческие коллективы СШ №8.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора


Творческий номер


Награждение

Посвятили в музыканты


Маленькая артистка


Мюзикл "Репка"

В СШ №8 учеников первых музыкальных классов посвящали в музыканты. Это мероприятие уже стало традиционным и носит название «Сольфджинка».

Первоклассники подготовили интересное выступление — мюзикл, в основу которого была положена русская народная сказка «Репка», и различные музыкальные номера.

На этом мероприятии родители смогли увидеть, чему научились их дети за весь год.

После выступления ребятам вручили дипломы о посвящении в юные музыканты.

Екатерина ЯНУШЕВИЧ
Фото автора

ВІКТАРЫНА "МАЯ РАДЗІМА — БЕЛАРУСЬ"

II тур
Што гэта?

Заданне №19

Лепшы знаўца нашай краіны атрымае каштоўны прыз — мабільны тэлефон!



Нерукатворны абраз, які з'явіўся на дрэве грушы ды шануецца адначасова і каталікамі, і праваслаўнымі. Што гэта за абраз і ў якім месцы ён з'явіўся?

Пераможцам віктарыны стане той, хто набярэ найбольшую колькасць балаў.

Адна з умоў — у віктарыне ўдзельнічаюць толькі дзеці ад 7 да 15 гадоў.

Сябры! Віктарына хутка скончыцца! Знаўцаў чакае яшчэ 1 заданне.

ДАСЫЛАЙЦЕ СВОЙ АДКАЗ У SMS-ПАВЕДАМЛЕННІ НА НУМАР (8 029) 133-04-21 ДА 5 ЧЭРВЕНЯ!

На пытанне ў прошлым нумары: ***"Яны ёсць у Слоніме, Мінску, Віцебску, Магілёве, Нясвіжы, Чачэрску, і іх сталі будаваць пасля ўвядзення гарадскога самакіравання на аснове Магдэбургскага права. У Слоніме яна з'явілася ў другой палове XVIII стагоддзя. На якой вуліцы яна знаходзіцца сёння?"*** — правільна адказала **Віялета ЯСКЕЛЬЧЫК**

Гэта ратуша.
Яна знаходзіцца на вуліцы Савецкай.


Былая ратуша

Дарья Хвесеня: «СТАРАЙТЕСЬ — И ВСЁ ПОЛУЧИТСЯ»


Юная художница за работой

В гимназии №1 проходит персональная выставка рисунков ученицы 4-го класса Дарьи Хвесеня. Стоит отметить, что недавно в конкурсе «Соблюдаем законы дорог» в номинации «рисунок» Даша заняла первое место. Корреспондент «Отдушины» встретилась с маленькой художницей и задала ей несколько вопросов.

—Даша, как давно ты начала заниматься рисованием?

—По словам моей мамы, я начала рисовать с самого раннего детства и делала это чаще всего со своим дедом Васей. Как только у него появлялась свободная минутка, я просила его, чтобы он со мной порисовал.

—А потом?

—Потом родители отдали меня в кружок по рисованию. Теперь я посещаю кружок «Творчество», руководителем которого является Инесса Николаевна Алексейчик. А раньше рисованию у меня преподавала Татьяна Владимировна Сальго. На её персональной выставке в музее мои семь рисунков тоже присутствовали.

— Кто-нибудь ещё из твоей семьи занимается рисованием?

—Мой прадед Иван Мисько — знаменитый скульптор. Мама несколько раз возила меня к нему в мастерскую — для вдохновения и стимула в дальнейшем творчестве. Он видел мои рисунки, и они ему понравились.


На выставке

—Ты хранишь все свои рисунки?

—У меня есть большая папка, в которой находится большинство моих работ. Когда я иду на чей-то день рождения, я обязательно имениннику дарю рисунок.

—Даша, чем ты ещё увлекаешься?

—Хожу с удовольствием на гимнастику к Веронике Владимировне Тренкиной, и в этом у меня есть тоже неплохие результаты. В чемпионате Слонимского района по художественной гимнастике среди своих сверстниц я заняла третье место.

—А как проводишь свой досуг?

—В свободное время я помогаю маме по дому, присматриваю за тремя братиками и младшей сестрёнкой.

— Кем хочешь стать?

—Хочу стать моделью. Очень люблю смотреть передачу «Топ-модель по-американски» и мечтаю, когда вырасту, принять в ней участие.

—Что пожелаешь нашим маленьким читателям?

—По словам моей мамы, старанием, желанием и упорством можно добиться многого, так что старайтесь — и всё получится.

Как рассказала корреспонденту мама юного дарования, способности её дочери выявили еще в детском саду.

Когда Даша проходила тест на готовность к школе, были обнаружены её творческие задатки. Выполняя задание по раскраске фигур, Даша единственная из воспитанников детсада раскрасила фигуры разными цветами. По словам психолога, это первый признак творческой личности.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора

Старонку падрыхтавала Жанна ПЛЕШКО

Главный редактор Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

Учредитель **Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК**

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 5-09-27
звонить с 9.00 до 18.00

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним-9, а/я 32
Адрес редакции: ул. Коссовский тракт, 37, офис 16
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Над номером работали:
журналисты: Екатерина ЯНУШЕВИЧ, Сергей ЧИГРИН
фотокорреспондент Татьяна ПЛАХЕТКО
дизайнер Дмитрий ПОТУРЕМСКИЙ
стиль-редактор Жанна ПЛЕШКО

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Тираж номера **5500** экз.

Время подписания к печати по графику 31 мая 2011 года 15:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8-(044) 715-90-03
8-(044) 762-48-39
Павильон № 88, рынок «Коссовский»

Объем — один условный печатный лист.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
Заказ № 3303

Свободная цена

ISSN 1991-3362



Регистрационное свидетельство №65 от 5 марта 2009 года выдано Мин. информации РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.